№ 5 (92)

# ПАХОДНЯ

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Сакавік 2009 г.

*Калонка рэдактара*

# Усё "семінарым"...

У апошні час у мяне, як і ў шмат каго з маіх землякоў-бялынічан, пачало складвацца ўражанне, што наш Бялыніцкі раён па сваім фінансавым магчымасцям паступова пачаў набліжацца да эмірата Кувейт. Калі вы, паважаныя чытачы, запытаеце, чаму я прыйшоў да такой высновы, я з задавальненнем адкажу – а як інакш растлумачыць тую вялікую колькасць разнастайных семінараў, якія праводзяцца ў нас у раёне ў апошні час? Пры тым усё гэта адбываецца пад час крызісу, які апанаваў увесь свет і калі кіраўніцтва нават самых багатых краін старанна эканоміць літаральна кожны цэнт грошай. Праўда, як кажа наш правадыр, у Беларусі крызісу няма. Іншая справа, што, сапраўды, нашых "любімых" кіраўнікоў, пры іх узроўні даходаў, ніякія крызісы не закрануць, а простыя беларусы ўжо даўно лічаць апошнюю капейчыну, каб неяк выжыць.

Але нават некаторыя нашы вялікія начальнікі нарэшце зразумелі, што прыйшоў час эканоміць сродкі падаткаплацельшчыкаў. Нават прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі расказаў уражаным чыноўнікам, што вось ужо пяць гадоў піша адной ручкай. Пасля гэтага па ўсёй "вертыкалі ўлады" распачалася шумная кампанія па эканоміі сродкаў на канцтаварах. Праўда, на мой погляд, нашмат прасцей зэканоміць грошы, калі рэзка скараціць колькасць гэтых самых "вертыкальных" чыноўнікаў. Ні для каго не сакрэт, колькі іх развялось за гады праўлення ўсенароднаабранага. Па дадзеных на пачатак 2008 года, чыноўнікаў ад улады стала ў 2, 5 разы больш, чым у 1990 годзе, пры тым, што насельніцтва Беларусі за гэты час скарацілась на 700 тысяч чалавек. Ды вы самі выдатна ведаеце, шаноўныя чытачы, колькі будынкаў у Бялынічах



Адміністрацыйны будынак МТК у вёсцы Вялікая Машчаніцы

займаюць зараз розныя кіруючыя структуры. Адбываецца парадаксальная сітуацыя – з кожным годам народа ў Бялыніцкім раёне становіцца усё менш, а "слуг народа" – усё больш.

Напэўна, каб даказаць сваю патрэбнасць і значнасць, нашы шматлікія чыноўнікі і праводзяць семінар за семінарам, дзе дзеляцца са сваімі ж калегамі (дарэчы, за дзяржаўны кошт) шматлікімі "поспехамі". Толькі ў лютым у нас у Бялыніцкім раёне адбыліся самыя разнастайныя семінары розных узроўняў: работнікаў культуры, райспажыўтаварыства, органаў мясцовай улады, сустрэча вонаў-інтэрнацыялістаў з чатырох раёнаў і г. д. На падрыхтоўку і правядзенне кожнага мерапрыемства было выкінута процьма дзяржаўных грошай, адрываліся ад сваёй працы дзесяткі, калі не сотні, людзей. Усіх шматлікіх ўдзельнікаў трэба ж накарміць, павазіць па аб'ектах і г. д. Навошта так шыкаваць, калі наша самая стабільная ў свеце дзяржава выпрашвае крэдыты ў каго толькі можа (а калі не атрымае чарговы, дык можа быць поўны "стабілізец"),



Гатэльны комплекс «Мара» у вёсцы Вялікая Машчаніца

(Працяг на ст. 2)

# Усё “семінарым”…

(Працяг. Пач. на ст. 1)

а простыя працаўнікі ўсе як адзін скардзяцца на зніжэнне заробкаў, я ніяк не магу зразумець. Калі грошы няма куды дзяваць, дык аказалі б лепш дапамогу дзецям з сем’яў з нізкім узроўнем даходаў ці маламаемым пажылым людзям. Дык не, лепш займацца такой “дурнёй”, як на рэспубліканскім семінары спажыўтаварыства: забраць стэлажы для тавараў з магазіна вёскі Вялікая Машчаніца і завезці іх для стварэння “паказухі” у Цяхцін, а пасля мерапрыемства вярнуць іх зноў на месца… І такіх “прыколаў” процьма…

Але самыя “цікавыя” уражанні ў мяне асабіста склаліся ад апошняга рэспубліканскага семінара, які праходзіў у нас у Бялыніцкім раёне. Напрыканцы лютага нашы “слугі народа” – дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь - вывучалі асноўныя накірункі рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі на прыкладзе Бялыніцкага раёна. Справа ў тым, што на вясенняй сесіі народныя абраннікі плануюць разгледзець новую рэдакцыю Закона Рэспублікі Беларусь “Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі”. Таму і вырашылі выехаць у рэгіёны, пагутарыць з выбаршчыкамі, паглядзець, як жыве і працуе моладзь. Наведваючы Бялыніцкі раён, парламентарыі азнаёміліся з работай маладзёжных вытворчых брыгад на МТК “Вялікая Машчаніца” і гатэльнага комплекса “Мара” ААТ “Новая Друць”, а таксама пабывалі ў маладзёжным цэнтры “Ветразь” і фізкультурна-аздараўленчым комплексе “Друць”. Зацікавіў дэпутатаў і вопыт СВК “Калгас “Радзіма” па замацаванню на вёсцы маладых працаўнікоў.

Мне асабіста стала радасна за народных абраннікаў, абсалютная большасць якіх – прадстаўнікі наменклатуры розных узроўняў, - што яны нарэшце зацікавіліcь жыццём простага народа. Праўда, каб яны хацелі паглядзець сапраўдныя ўмовы жыцця і працы моладзі, яны б не ладзілі б семінар, напярэдадні якога некалькі тыдняў у нашым раёне старанна наводзілі “паказуху”, а проста б знянацку прыехалі і пахадзілі па вуліцах малых гарадоў і вёсак. Магчыма, тады б сапраўды змаглі даведацца, як жыве сучасная моладзь. А так толькі выкінулі дзяржаўныя грошы на вецер. Што з сапраўднага паўсядзённага жыцця можна было ўбачыць на жывёлагадоўчым комплесе ў вёсцы Вялікая Машчаніца, дзе напярэдадні семінара палова працаўнікоў ААТ “Новая Друць” старанна наводзіла лоск? Напярэдадні візіту высокіх гасцей жывёлаводы нават кароў мылі…Тое самае адбывалася і ў гатэльным комплексе “Мара”, дзе пад мудрым кіраўніцтвам райвыканкамаўскіх чыноўнікаў ухіляліcь магчымыя і немагчымыя недахопы. Пад канец пра гэта “кіраўніцтва” бедныя жанчыны, што там працуюць, пачалі выказвацца выключна ненарматыўнай лексікай, бо “дасталі” іх па поўнай праграме…Дабаўлю толькі, што на адзін лёгкі “перакус” для народных абраннікаў у кафэ “Мара” ААТ “Новая Друць” гаспадаркай было выдзелена тры мільёны рублёў…А колькі “ляснула” грошай на падрыхтоўку і правядзенне ўсяго семінара…

Самае цікавае - які вопыт вывучалі ў нас у Машчаніцы шаноўныя дэпутаты? Калі верыць дзяржаўнай прэсе, то вопыт працы маладзёжных працоўных брыгад. Абласное тэлебачанне (праграма “Навіны-рэгіён) нават паведаміла, што дзякучы працы гэтых брыгад прадукцыйнасць працы на ўчастках, дзе яны працуюць, узрасла на 40%. Як такое можа быць, я не ведаю. Тыя маладыя людзі, што працуюць у маладзёжнай брыгадзе на комплексе у Машчаніцы, заслугоўваюць самай глыбокай павагі, бо праца гэта вельмі цяжкая. Але, усё жыццё пражыўшы у гэтай вёсцы, магу дакладна сказаць – з 5 членаў брыгады тры (ветурачы Міхаіл Шатарнаў і Сяргей Чалнакоў, мой сусед – механізатар Толік Козыраў) толькі некалькі месяцаў, як пачалі сваю працоўную дзейнасць і ніяк на прадукцыйнасць працы паўплываць немаглі. Іншыя два члены брыгады – галоўны заатэхнік Алег Шарснёў і заатэхнік-селекцыянер Аксана Думаронак - сапраўды працуюць ужо больш працяглы час і вялікае дзякуй ім за гэтую цяжкую працу. Аднак асноўная заслуга Аксаны, па словах раённай газеты “Зара над Друццю”, гэта тое, што яна займалася вывядзеннем новых высокаўдойных парод кароў і павышэннем прадукцыйнасці жывёлы венгерскай селекцыі. Хачу паведаміць шаноўным калегам з раённай газеты, што, каб вывесці новую пароду кароў, шматлікія спецыялісты працуюць дзесяцігоддзямі і за часы незалежнасці Рэспублікі Беларусь не адной новай пароды буйной рагатай жывёлы ў краіне не створана. Ну а што датычыцца купленай за вялікія валютныя грошы жывёлы венгерскай селекцыі, то ні для каго ў Машчаніцы не з’яўляецца сакрэтам, што большая частка гэтай жывёлы даўно апынулася на мясакамбінаце.

(Заканч. на ст. 3)

# Усё “семінарым”…

(Заканч. Пач. на ст. 1-2)




А чым маладым жывёлаводам дапамог ГА “БРСМ”, наогул не вельмі зразумела – прыгожыя дзяўчаткі з нашага раённага камітэта гэтай арганізацыі кароў не кормяць і не дояць, а атрымліваюць свой неблагі заробак за “ідэйнае натхненне” моладзі. Можа, лепш бы натхнялі асабістым прыкладам дзе-небудзь на ферме, як камсамольцы 20-х гадоў, а не рабіліс маладымі бюракратамі? У маладзёжнай брыгадзе гатэльнага комплекса “Мара” наогул ў апошні час адбыліся скарачэнні і там зараз налічваецца тры чалавекі. Нейкі прыбытак гаспадарцы прыносіць толькі гатэль, кафэ “Мара” не пакрывае нават выдаткаў на сваё утрыманне.

Раённая газета “Зара над Друцццю” адзначыла таксама, што аддзел па справах моладзі Бялыніцкага райвыканкама выйшаў пераможцай у сваёй падгрупе па рабоце з моладдзю. Тут я наогул не разумею – навошта на наш невялікі раён утрымліваць за дзяржаўны кошт дзве паралельныя структуры, якія павінны займацца праблемамі моладзі – аддзел па справах моладзі і райкам ГА “БРСМ”? Можа, сапраўды, нам няма куды грошы падзець? Бо, паверце мне на слова, сябрам маладзёжных апазіцыйных альбо хрысціянскіх арганізацый аддзел па справах моладзі ніколі не дапамагаў. А ёсць жа яшчэ ідэалагічны аддзел райвыканкама, які займаецца, па-сутнасці, тымі самымі пытаннямі і супрацоўнікі якога таксама атрымліваюць вельмі нядрэнную зарплату. Дарэчы, узначальвае аддзел па справах моладзі паважаная жанчына – Лідзія Аляксандраўна Шчацінка, але яна даўно ўжо выйшла з маладзёвага ўзросту і мае дарослых дзяцей. Як кажуць самі супрацоўнікі райвыканкаму, гэту пасаду ёй далі, каб яна магла дзе-небудзь пераседзець час, пакуль не пойдзе на пенсію кіраўнік аддзелу адукацыі райвыканкама Мікалай Пашкоўскі (Лідзія Аляксандраўна адна з верагодных кандыдатур на яго пасаду). На маю думку (і тут са мной пагаджаюцца абсалютна ўсе маладыя людзі, з якімі я гутарыў на гэту тэму) аддзел па справах моладзі, калі ён існуе, павінен узначальваць малады чалавек, які нашмат лепш ведае праблемы гэтай самай моладзі, бо з’яўляецца яе часткай.

Закончыць свой артыкул хочацца пажаданнем да кіраўнікоў нашага раёна: можа, на сам рэч, трэба перастаць выкідваць дзяржаўныя грошы на правядзенне нікому непатрэбных тусовак-семінараў, а пусціць іх на аказанне дапамогі маламаёмым грамадзянам? Калі ж ужо так хочацца “семінарыць”, то праводзіць гэтыя мерапрыемствы можна за кошт уласных заробкаў нашых кіраўнікоў і шматлікіх спецыялістаў райвыканкама, яны ў іх, параўнальна з простымі працаўнікамі Бялыніцкага раёна, нядрэнныя.

***Барыс Вырвіч***

# Беспрацоўных амаль няма?

Па стану на 1 студзеня 2009 года ў Бялыніцкім раёне зарэгістраны 82 беспрацоўных, на адпаведную дату мінулага года іх было 134. Узровень беспрацоўя складае 0,9 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва раёна пры прагнозным паказчыку 1.6 працэнта.

Дапамогу па беспрацоўю атрымліваюць 45 чалавек.

За мінулы год у якасці беспрацоўных было зарэгістравана 743 чалавекі, працаўладкаваны – 519, пры прагнозным паказчыку 500.

На працягу года на новастворапыя рабочыя месты ўладкавана 278 чалавек, у тым ліку 237 – у Бялынічах.

На прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі на працягу прайшоўшага года накіроўваліся 46 беспрацоўных; пяці беспрацоўным аказана 11,6 мільёнаў рублёў фінансавай дапамогі ў выглядзе субсідый і кампенсацый затрат на афармленне прадпрымальніцкай дзейнасці; тром сем’ям беспрацоўных аказана садзейнічанне ў перасяленні, у раён прыбылі на месца жыхарства 6 сем’яў беспрацоўных з іншай мясцовасці. За мінулы год працаўладкаваны па броні 40 чалавек з ліку грамадзян, якія не здольныя на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы.



# Дэмакратычная моладзь Магілёва адкрыла «сацыяльны офіс»



*Крысціна Шацікава*

У Магілёве намаганнямі Моладзевых Дэмакратычных Сілаў (МоДэС) з'явіўся «сацыяльны офіс». Урачыстае адкрыццё цэнтра адбылося ў сярэдзіне лютага.

«Сацыяльны офіс» аб'ядноўвае больш за 30 валанцёраў. Ідэя з'явілася сярод маладых людзей, якія хочуць займацца сацыяльнай працай. Не заўсёды ў Магілёве сацыяльныя службы могуць дапамагчы людзям, таму МоДэС вырашылі адчыніць сацыяльны офіс, кажа офіс-менеджэр **Аксана Закрэўская**:

*»Мы вырашылі рэалізоўваць такі праект, як «сацыяльны офіс». У рамках праекту будзе аказвацца розная дапамога: кансультацыі, валанцёрская падтрымка розным слаям насельніцтва. У першую чаргу мы арыентаваныя на студэнтаў, гэтак жа на пенсіянераў».*

Таксама ў «сацыяльным офісе» можна атрымаць юрыдычную дапамогу, і адмоўлена не будзе нікому, кажа юрыст **Сяргей Фамін**:

*»Гэта аказанне юрыдычнай дапамогі — бясплатнай, абсалютна ўсім слаям насельніцтва. Мы не будзем адмаўляць у кансультацыі нікому, ні па якіх пытаннях».*

Валанцёрка **Крысціна Шацікава** кажа, што многія маладыя людзі выйшлі з палітычных акцыяў, і яны хочуць нешта рабіць і рэальна дапамагаць людзям:

*»Проста палітычныя акцыі могуць паказаць грамадству і Еўропе, што ў нас нейкія беспарадкі. Але для таго каб нешта змяніць у краіне, трэба паказаць людзям, што мы можам не толькі казаць, але і рабіць. Не казаць людзям, як ім дрэнна жывецца, а паказаць, што можна лепш. І паказаць, што вось мы з вамі гатовыя за руку прыйсці і зрабіць гэта разам».*

*»Мае сябры з нядбайных сем'яў часта патрабуюць дапамогі. Таму я вырашыла дапамагаць»,* — кажа **Аксіння**, вучаніца 37-й школы.

***Юрась Вітальеў, Магілёў***

# Магілёў: БНФ атрымаў офіс

Жыльлёва-эксплюатацыйная ўправа Ленінскага раёну Магілёва выдзеліла памяшканьні для абласной арганізацыі партыі БНФ і грамадзкага аб'яднаньня «Рух БНФ «Адраджэньне». Напрыканцы лютага іх кіраўнік Рыгор Кастусёў атрымаў адпаведныя лісты за подпісам дырэктара ўправы Аляксандра Асінцава.

Камунальнікі здаюць партыйцам і актывістам Руху памяшканьні ў арэнду на тры гады. Рыгор Кастусёў зьвязвае рашэньне камунальнікаў са зьменай кіраўніцтва аблвыканкаму, камунальных службаў, а таксама з абвешчанай уладамі лібэралізацыяй:

«Цяпер гарвыканкам павінен зацьвердзіць пастанову камунальнікаў. Я спадзяюся, што так яно й будзе, бо наўрад ці камунальныя службы прымалі рашэньні без папярэдняга ўзгадненьня з гарадзкой уладай. Памяшканьні нам выдзеленыя па вуліцы Цыялкоўскага ў адным будынку. У ім раней знаходзілася сядзіба руху, і адтуль нас спрабавалі на працягу двух гадоў выселіць. Цяпер жа даюць лепшае памяшканьне. Што да партыйнай арганізацыі, то яна ня мела сядзібы ад 2001 году. За гэты час была скасавана яе рэгістрацыя. Цяпер абласную структуру мы можам зарэгістраваць наноў».

***Belarda.org***




*Рыгор Кастусёў*

## Аб'ява

Усе нумары газеты "Паходня" у фармаце PDF можна прачытаць у інтэрнэце па адрасу: http://kamunikat.org/pachodnia.html

# 25 сакавіка - 91-я ўгодкі абвяшчэння БНР

25 сакавіка 1918 года ў Мінску 3-яй Устаўнай граматай Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай і вольнай дзяржавай. У яе склад былі ўключаны Магілёўская, Мінская, Віцебская, беларускія часткі Гродзенскай, Віленскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і суседніх губерняў.

У межах Беларусі былі абвешчаны свабоды: слова, друку, сходаў, забастовак, сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля, права на аўтаномію, раўнапраўе моў усіх нацыянальнасцяў Беларусі. Права прыватнай уласнасці на зямлю не адмянялася. Зямля павінна была перадавацца бясплатна тым, хто яе апрацоўваў. Лясы, воды і нетры зямлі аб'яўляліся ўласнасцю БНР. Паўсюдна ўстанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

Была зацверджана часовая канстытуцыя, пячатка БНР, бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". Дзяржаўная і абавязковая мова БНР – беларуская. Летам 1918 года выпушчаны пашпарты грамадзян БНР.

Фактычна або юрыдычна БНР у 1919—1920 прызналі Украінская Народная Рэспубліка, Літва, Латвія, Эстонія, Чэхаславакія, Германія, Балгарыя, Фінляндыя, Турцыя і іншыя дзяржавы.


(OFFICIAL WEBSITE)

Са снежня 1918 года пасяджэнні ўраду БНР праходзілі ў Гродна.

З 5 студзеня 1919 года і да гэтай пары Рада БНР дзейнічае на эміграцыі.

# Магілёўскія ўлады ня хочуць успамінаць прызнаньня БНР

Ініцыятыўная група па зборы подпісаў за ўсталяваньне ў Магілёве інфармацыйнай шыльды ў гонар БНР падала скаргу ў ідэалягічны аддзел аблвыканкаму. Моладзевыя актывісты намагаюцца адмяніць пастанову гарвыканкаму, які не дазволіў зьдзейсьніць іхны намер.

**Ініцыятыву актывістаў па ўсталяваньні шыльды ў гонар БНР падтрымалі сваімі подпісамі болей за шэсьцьсот магілёўцаў.**

**Паводле магілёўскіх гісторыкаў, 12 ліпеня 1918 году ў цяперашнім будынку абласнога краязнаўчага музэю прадстаўнікі грамадзкасьці прызналі ў горадзе ўладу БНР. На сьцяне гэтага будынку й прапаноўвалі ўсталяваць шыльду актывісты.**

**Адмову гарвыканкам матываваў тым, што нібыта супрацоўнікі музэю супраць усталяваньня шыльды. Акрамя таго, на думку гарвыканкаму, няма дакумэнтальнага пацьверджаньня таго факту, што магілёўская грамадзкасьць прызнала ўладу Беларускай Народнай Рэспублікі ў горадзе.**

**Да скаргі ў аблвыканкам актывісты дадалі гістарычную даведку пра падзеі 1918 году. Яе падрыхтаваў магілёўскі гісторык Ігар Пушкін.**

**Што да краязнаўчага музэю, то, паводле старшыні ініцыятыўнай групы Тацяны Буланавай, яго супрацоўнікі паабяцалі даць пісьмовае абгрунтаваньне сваёй пазыцыі.**

**Зьвесткі пра сход прадстаўнікоў грамадзкасьці Магілёва і прызнаньне ім улады БНР знайшоў у гістарычнай літаратуры мясцовы гісторык Ігар Пушкін. Паводле яго, сход адбыўся 12 ліпеня 1918 году з ініцыятывы Магілёўскага нацыянальнага камітэту, якім кіраваў Міхаіл Кахановіч. У сходзе ўдзельнічалі каля чатырохсот магілёўцаў. Яны, як сьцьвярджае гісторык, большынёй галасоў і прызналі ў Магілёве ўладу БНР.**


(RFE/RL)

*Краязнаўчы музей у Магілёве*

***Радыё Свабода (Магілёў)***

*Экономика*

# Богданкевич: «Беларусь стоит на пороге обвального банкротства»

**Экономический кризис в Беларуси начался еще в 2007 году и причина его – административно-командная система Лукашенко.**



***Станислав Богданкевич***

О причинах и больных местах белорусского экономического кризиса в статье для Camarade.biz рассказал бывший председатель правления Национального банка Беларуси, доктор экономических наук, профессор **Станислав Богданкевич**:

И Александр Лукашенко, и Сергей Сидорский, и другие белорусские руководители высокого ранга не раз заявляли о том, что кризис в белорусскую экономику пришел извне. Мол, кабы не «нахимичили» с ценными бумагами на своих биржах американские и прочие западные финансовые спекулянты, так отечественная экономика поныне процветала бы.

Не могу с этим согласиться. Все познается в сравнении. Административно-командная система, удушающая инициативу людей и консервирующая отсталость, не сегодня привела нашу страну к отставанию по важнейшим социально-экономическим показателям. В сравнении с Литвой и Польшей, избравшими демократию и рынок, в Беларуси средняя зарплата и пенсия оказались в 2-3 раза ниже при примерно одинаковых ценах на потребительские товары. Причем наши западные соседи не имеют столь льготных условий, как наша страна. Беларусь до сих пор получает российские энергоносители по выгодным ценам. В иные годы внешние субсидии доходили до 8-10 миллиардов долларов.

Однако впрок они не пошли. Экономическая политика в стране и прежде, и сейчас направлена преимущественно на сохранение устаревшей производственной структуры. Тормозилось развитие малого и среднего бизнеса. Отечественные экономика и финансы, а вместе с ними и вся социальная сфера, опасно зависят от товарного экспорта. Если в России его доля в ВВП составляет 30%, в Китае, заполонившем своими изделиями весь мир, - около 37%, то в Беларуси - 70%. Кроме того, наш экспорт зависим от импорта сырья, энергоносителей и комплектующих и имеет низкую добавленную стоимость. По сути, многие белорусские предприятия завозят все необходимое за тысячи километров из России, здесь собирают среднего качества изделия и везут их продавать обратно в Россию.

Такая экономика эффективной быть не может. Импорт вырос до абсолютно неприемлемых размеров и составляет 65-70% к объему ВВП. Из-за чрезмерных изъятий средств в бюджет (уровень - более 50% ВВП) слабо решались вопросы модернизации, технологического и технического обновления предприятий.

Слабость отечественной экономики проявлялась на протяжении многих лет в виде убыточности, утраты оборотного капитала, закредитованности, роста складских запасов, увеличения дебиторско-кредиторской задолженности, высокой инфляции. Экономика все больше теряла свою конкурентоспособность.

В открытой форме кризис в Беларуси проявился в 2007 году – задолго до обвала на мировых и российском фондовых рынках. В позапрошлом году дефицит счета текущих операций вырос по сравнению с 2006 годом сразу вдвое. Отрицательное внешнеторговое сальдо по товарам достигло 10% к объему ВВП. Во взаимной торговле с Россией оно удвоилось. Размер совокупного внешнего долга возрос почти на 6 миллиардов долларов или в 1,8 раза, а внутреннего - в полтора раза.

В прошлом году эти негативные процессы только усугубились. Отрицательное сальдо во внешней торговле товарами увеличилось еще в полтора раза и достигло 6,6 миллиарда долларов, а во взаимной торговле с Россией превысило 13 миллиардов долларов. Высокими темпами продолжался рост внешней и внутренней задолженности.

**(Окончание на ст. 7)**

# Богданкевич: «Беларусь стоит на пороге обвального банкротства»

*(Оконч. Нач. на ст. 6)*

Остатки непроданной продукции на складах увеличились до 5 триллионов рублей, а просроченная задолженность даже несколько превысила эту огромную сумму. За последние три года инфляция удвоилась и в минувшем году достигла 13,3%. На товары повседневного спроса цены за прошлый год выросли еще больше - примерно на 20%.

Все это закономерно привело к девальвации рубля и связанному с ней всеобщему снижению уровня жизни населения.

Сейчас возможности ценовой российской поддержки заканчиваются. В мире происходит рецессия и цены на основные белорусские экспортные товары падают. Если называть вещи своими именами, то страна стоит на пороге обвального банкротства. Внешние заимствования, направленные на латание финансовых дыр и потребление, кризис в Беларуси не остановят. Как и косметические улучшения действующей модели хозяйствования. Важно понимать, что финансовые и валютные проблемы страны - вторичны. Главная проблема Беларуси - отсталая затратная экономика и ошибочная модель развития.

# МАП: Беспрацоўе ў Беларусі ў 5—6 разоў вышэйшае за афіцыйны паказчык

Узровень беспрацоўя ў Беларусі, калі разлічваць паводле метадалогіі Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), дасягае 4,8% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Гэткія звесткі падае «Экономическій бюллетень» навукова-даследчага інстытуту Міністэрства эканомікі.

Як вядома, афіцыйна беспрацоўе ў Беларусі застаецца на ўзроўні 0,9%, бо людзям няма сэнсу рэгістравацца ў якасці беспрацоўных — дапамога па беспрацоўі мізэрная, затое ганяюць на грамадскія працы амаль задарма.

# Цены на алкоголь и сигареты повысят еще на 10%

Министерство финансов Беларуси подготовило проект, предусматривающий повышение ставок акцизов на алкогольную и табачную продукцию в среднем на 10%.

Кроме того, как сообщает «Интерфакс», Минфин предлагает ввести акцизы на газовое топливо для автомобилей.

Представитель Минфина отметил, что повышение акцизов и расширение сферы их применения планируется в связи с необходимостью привлечения дополнительных источников доходов бюджета. Кроме того, он напомнил, что в соответствии с госпрограммой борьбы с пьянством предусмотрено увеличение акцизов.

# Снова на горбачевские «грабли»?

**В Беларуси намерены законодательно ввести возрастное ограничение на продажу спиртных напитков до 21 года. Такое положение содержится в законопроекте «Об основах государственной молодежной политики», который будет рассмотрен Палатой представителей на предстоящей весенней сессии. Определенные сомнения вызывает смысл этого действия. Потому что запретительными мерами проблему алкоголизации населения, все-таки, видимо, не решить.**

В информации ”БЕЛТА” отмечено, что «впервые законопроектом предлагается увеличить возрастное ограничение продаж спиртных напитков в Беларуси с 18 до 21 года». Да позвольте, все это уже было. Причем не так давно – во времена пресловутого горбачевского «сухого закона». Ну и что?

Моя молодость пришлась аккурат на середину 80-х. То есть двадцати одного года нам тогда как раз таки не было. Но сверстники все равно находили возможность приобрести «запретный плод». В ход шли разные ухищрения – начиная с того, что в магазин отправлялся кто-то выглядевший старше своих лет (а теперь и подавно – поди пойми по нынешней молодежи – 18 ему или 21?) до элементарной просьбы к старшим товарищам купить спиртное. Или к местному люмпен-пролетариату, который всегда в изобилии кучкуется возле соответствующих торговых точек и готов на любые подвиги за минимальные пожертвования. В общем, как в известной поговорке – свинья везде грязь найдет. Было бы желание.

***Сергей Аверьянов***

*Ведай нашых!*

У мінулым месяцы на польскім тэлеканале “Белсат” прайшла інфармацыя пра падзеі, якія адбываліся ў нашым Бялыніцкім раёне. Думаю, чытачам “Паходні” будзе цікава даведацца, чым “праславіўся” наш раён, таму мы цалкам прыводзім змест гэтага матэрыяла.

# «ЧАЛАВЕК ГОДА» СУПРАЦЬ БЕЛАРУШЧЫНЫ?




***Алег Мяцеліца***

Дырэктарка мясцовай гімназіі сталася “Чалавекам года – 2008” у Бялынічах. Прэмію гэтую дае райвыканкам за выбітныя дасягненні. Бацькі вучняў лічаць, што галоўная «заслуга» Таццяны Балдышэўскай – гэта... адмова ў стварэнні беларускамоўнага класа ў сваёй школе.

У сям’і Мяцеліцаў двое школьнікаў. Бацькі вельмі хацелі б, каб малыя атрымлівалі адукацыю па-беларуску. Па падтрымку яны звярнуліся да дырэктаркі гімназіі ды настаўніцы беларускай мовы Таццяны Балдышэўскай.

АЛЕГ МЯЦЕЛІЦА, БАЦЬКА:

«Выглядала гэта не так, што яна проста выказвалася супраць. А калі былі бацькоўскія сходы, на якія нас, дарэчы, не запрасілі, там, дзе навучаецца сын (малодшыя класы), папершае, была прамова: яна пужала бацькоў, як будзе складана, што адчыніцца беларускі клас, з якімі яны сутыкнуцца цяжкасцямі».

Каментаваць сітуацыю нашаму каналу сама Таццяна Балдышэўская адмовілася. У райвыканкаме ж гавораць, што рашэнні прымаліся калегіяльна з улікам усіх фактараў і памылкі быць не можа.

НАДЗЕЯ СЕРЫКАВА, НАМ. СТАРШЫНІ РАЙВЫКАНКАМУ:

«Гэта не чыёсьці было меркаванне, і па адкрыцці класаў, каб гэта менавіта Балдышэўская асабіста яго прымала, і па прысваенні ёй гэтага ганаровага звання і прэміі, таксама гэта не адзін чалавек прымаў гэтае рашэнне».

Таццяна Балдышэўская тройчы перамагала ў раённым конкурсе «Настаўнік года», а гімназію чатыры гады запар прызнавалі «Установай узорнага парадку». Іншую прычыну прысваення ганаровага звання дырэктарцы гімназіі бачыць Алег Мяцеліца.

АЛЕГ МЯЦЕЛІЦА, БАЦЬКА:

«Напэўна, яна за гэта і атрымала, за тое, што зрабіла ўсё магчымае, каб гэты клас не адчыніўся. Хто загадваў, той і даваў узнагароду».

Колькасць школьнікаў, якія навучаюцца па-беларуску, з



***Таццяна Балдушэўская***

1997 года стала памяншаецца (1996/1997 г. – 32,9% ад агульнай колькасці вучняў, 2008/2009 г. – 18,4%). Калі тэндэнцыя захаваецца, то праз некалькі гадоў беларускамоўныя школы могуць увогуле знікнуць. У Бялынічах і цяпер няма ніводнай.

***Вольга Кляўчэня, «Аб’ектыў» 10.02.2009***

## Анекдот дня

У публічным доме дрэнна пайшлі справы. Гаспадыня і колер асвятлення мяняла, і ложкі перасоўвала, і шпалеры пераклейвала прыгожыя-дзівосныя. Нічога не дапамагло. Вырашыла, нарэшце, параіцца з адным разумным чалавекам, што рабіць, якая прычына заняпаду.

- А б…й мяняць не спрабавала? – коратка адказаў той.

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў